У адрозненне ад многіх іншых праяў знешняга свету (карцін прыроды, вобразаў стыхіі, прадметна-рэчавых аб'ектаў), пахі амаль не валодаюць самастойнай выразнай семантыкай ці сімволікай. Прад'яўленне аўтарскай перцэпцыі пахаў у мастацкім творы найчасцей заснавана на суб'ектыўных асацыяцыях і аналогіях.

Паводле спецыяльных даследаванняў [3], найбольш запатрабаванымі асацыяцыямі з'яўляюцца тыя, што звязаны з: 1) сінтэзам адчування (халодны, цёплы) і смаку (салодкі, горкі); 2) колерам (цёмны, светлы, празрысты); 3) настроем (вясёлы, бадзёры, рамантычны); 4) мышцавымі адчуваннямі (цяжкі, лёгкі); 5) пачуццём часу (ранішні, дзённы, вячэрні, начны); 6) функцыянальнасцю (поклічны, зманлівы, фантазійны, магічны, утульны); 7) інтэнсіўнасцю (тонкі, рэзкі, дурманны); 8) эмацыйнасцю (пяшчотны, агрэсіўны, спакойны).

Часта пахі ў літаратурных тэкстах служаць дапаўненнем да апісанняў прыроды ці гарадскіх ландшафтаў. Аднак важную ролю адыгрывае духоўны кампанент нюхальнай перцэпцыі. Пахі пераадольваюць межы часу і прасторы, засланяючы сваёй інтэнсіўнасцю дыханне сённяшняга дня. У паху ёсць памяць. Прынята спасылацца, як на класічны прыклад, на раман М. Пруста «У пошуках страчанага часу». Аднак не меншае майстэрства выявілі і прадстаўнікі іншых літаратур. Цудоўна ведаў, як пахне яго радзіма, А. Міцкевіч. Да чытача паэмы «Пан Тадэвуш» даносіцца, у прыватнасці, цудоўны пах бігасу, што бурліць у катлах, асабліва адчувальны пасля палявання на мядзведзя, а таксама водар кавы, густой, як стары мёд, і чорнай, нібы вугаль… Працэс мастацкага выяўлення ўспамінаў праз пахі атрымаў назву «феномен Пруста» і стаў літаратурным топасам, крыніцай бясконцых індывідуальных варыяцый у самых розных аўтараў [1, с. 7]. Вельмі значную ролю адыгрываюць водары і пахі ў мастацкай рэалізацыі матыву кахання, у тым ліку ў спалучэнні з раслліннымі вобразамі і ўстойлівымі сімваламі культуры. Яскравыя прыклады ў класічнай беларускай паэзіі — вершы П. Броўкі «Пахне чабор», П. Панчанкі «Белыя яблыні».

Аналіз твораў айчыннай літаратуры ў тыпалагічным параўнанні з асобнымі творамі прадстаўнікоў іншых літаратур мы вызначаем як перспектыву далейшай працы. У даследаванні мастацкай функцыі водараў і пахаў лічым мэтазгодным карыстацца паняццем «эманацыя». Гэта шматзначны міждысцыплінарны тэрмін, у аснове якога ляжыць метафарычны вобраз вытоку, што дае пачатак рацэ, але сам застаецца невычэрпным [5]. Можна сказаць, што пахі ў перцэпцыі літаратурных герояў — гэта эманацыя памяці.

**Заключэнне**. Водары і пахі, іх успрыманне, адносіны да іх, моўна-мастацкая інтэрпрэтацыя з'яўляюцца дынамічным культурным, гістарычным і сацыяльным феноменам. Важнае значэнне мае духоўны кампанент нюхальнай перцэпцыі, або эманацыя памяці. Разнастайнасць індывідуальных варыяцый «феномена Пруста» вызначае перспектыўнасць даследавання водараў і пахаў як аб'екта літаратуразнаўчай навукі.

### Спіс цытаваных крыніц


1. Ароматы и запахи в культуре / сост. О. Б. Вайнштейн. — 2-е изд., испр. — М. : Новое литератур. обозрение, 2010. — Кн. 1. — 616 с.

2. *Костяев, А. И.* Ароматы и запахи в истории культуры: знаки и символы / А. И. Костяев. — Изд. 3-е. — М. : ЛИБРОКОМ, 2012. — 144 с.

3. *Мамцева, В. В.* К вопросу о вербализации концепта «запах» в художественной литературе [Электронный ресурс] / В. В Мамцева. — Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article . — Дата доступа: 18.09.2018.

4. *Фарино, Е.* Запах / Е. Фарино // Введение в литературоведение : учеб. пособие. — СПб. : Изд-во РГПУ им. А. И. Герцена, 2004. — С. 333—342.

5. Эманация [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://поисксолов.рф.Wd . — Дата доступа: 23.10.2018.


УДК 821.161.3:82-343

**А. С. Гушча**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## РЫСЫ ЧАРАДЗЕЙНАЙ КАЗКІ Ў ТВОРЫ ПЯТРА ВАСЮЧЭНКІ «ЖЫЛІ-БЫЛІ ПАНЫ КУБЛІЦКІ ДЫ ЗАБЛОЦКІ»

**Уводзіны.** Чарадзейная казка — гэта скарбніца народнай мудрасці, якая ўводзіць чытача ў кола незвычайных падзей. У яе аснове — міфічнае светаўспрыманне, адметная сістэма вобразаў, а ў сюжэце абавязкова прысутнічае чарадзейства, супрацьстаянне незвычайных герояў і ворагаў [1, с. 733]. Казачная фантастыка стварае свой непаўторны свет, у якім, як і ў сапраўдным жыцці, змагаюцца сілы дабра і зла, дзе заўсёды перамагае справядлівасць. Чарадзейныя казкі заснаваны на вымысле аб цудадзейным; у той жа час у такіх казках фантастычнае спалучаецца з рэальным [2, с. 325]. Адным з найбольш цікавых

© Гушча А. С., 2019

і яркіх прыкладаў увасаблення чарадзейнай казкі ў сучаснай літаратуры з’яўляецца твор Пятра Васючэнкі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі», які складаецца з дзвюх казачных аповесцей.

**Асноўная частка.** У казцы Пятра Васючэнкі — літаратуразнаўцы, крытыка, празаіка, драматурга, эсэіста, аўтара фэнтэзі і дзіцячага пісьменніка — паказваецца даволі незвычайнае і насычанае прыгодамі жыццё паноў Кубліцкага і Заблоцкага, якія лічаць сябе сапраўднымі шляхціцамі. З-за ўласнай прагавітасці і недарэчнасці Кубліцкі і Заблоцкі пазбавіліся ўсёй маёмасці, засталася толькі ўбогая хаціна, партрэты продкаў ды невялічкая дзялянка рэпы на агародзе: «Пан Кубліцкі на сняданак, бывала, аплятаў засмажанага вепрука. Пан Заблоцкі адным махам мог выпіць цэлую барылу мёду. Нядзіўна, што гаспадарка ў абодвух звялася на нішто. Гаёк, палеткі, паша, каровы, свінні, птаства — усё ляснула з-за вялікай панскай ахвоты да яды. Засталася на дваіх адна ўбогая хаціна, у падполлі — вецер ды галодныя мышы» [3, с. 154].

Аснову сюжэта складаюць розныя незвычайныя, часам фантастычныя падзеі. Прыкладам увасаблення ў творы жанравых асаблівасцей чарадзейнай казкі з’яўляецца эпізод, калі паны даюць парады Куры-Шчабятуры наконт таго, якое кураня яна павінна вывесці:

«— А ў кураняці будуць усяго дзве ножкі? — трывожыцца пан Кубліцкі. — А ці можна, пані кура, каб адразу чатыры нагі?

— Сорак, сорак, — сіпіць пан Заблоцкі. — Падавай нам кураня-сараканожку.

— Можна і гэта, — згаджаецца Кура.

Але пану Заблоцкаму ніяк не ўладзіш.

— Каб і сала было на ім у далоню таўшчынёй! А ростам каб была з быка! Во!» [3, с. 169].

У чарадзейных казках абавязкова прысутнічаюць сілы, варожыя чалавеку. Розныя пачвары існуюць насуперак жаданню героя, які павінен іх перамагчы. У творы Пятра Васючэнкі страшыдла ўзнікае не «само па сабе», а менавіта праз жаданне сквапных паноў. Кубліцкі ды Заблоцкі хочуць узбагаціцца, іх «перамовы» з Курай-Шчабятурай і прывялі да з’яўлення «страхапуда», дзіўнай фантастычнай істоты: «Але вось у яйку нешта грукоча, нешта стукоча, як у малатарні, асыпаецца шалупінне — і перад панамі з’яўляецца куранятка. Няможна апісаць, што гэта быў за страхапуд. Гара гарою, наперадзе бычыныя рогі і свінячы лыч... Яно рохкае немым голасам, тады лопае скрыдламі — і паны валяцца на зямлю як падкошаныя» [3, с. 169].

Яшчэ адным прыкладам увасаблення чарадзейнага ў творы Пятра Васючэнкі з’яўляецца эпізод, калі паны пайшлі лавіць рыбу. Яны хацелі злавіць не простую рыбу, а цэлага кіта: «А нам драбяза не патрэбна. Нам бы сама злавіць. Або кіта» [3, с. 180]. Калі паны вырашылі лавіць кіта, яны выйшлі на бераг рэчкі і сталі яго ветліва клікаць: «Пане Кіт, га, пане Кіт! Просім сюды!..» [3, с. 168]. Кіт прыплывае па жаданні паноў: «За трыдзевяць зямель плавае на моры-акіяне аграмадны Кіт-Велярыб. Ён чуе лямант, які справілі паны, заходзіць з мора ў Нёман. З Нёмана — у рэчку Парэчку» [3, с. 168]. Гэты эпізод мае фантастычны змест: вялізны Кіт з мора пераплывае ў маленькую рачулку да паноў. Аўтар іранізуе з сваіх герояў: каб злавіць вялізную рыбу, ім дастаткова паклікаць яе. У творы, аднак, гучыць думка, што хуткага і лёгкага багацця не бывае, дабрабыт павінен здабывацца працай. Таму паны ў выніку і застаюцца пры сваёй гаспадарцы, «зведзенай на нішто».

Прагнасць паноў прыводзіць іх да сустрэчы з наступным страшыдлам — незвычайнай свіннёй. Паны вырашылі купіць сабе свінню, але не абы-якую, а далікатную, з крыламі: «Нам не трэба свіння, якая рохкае. Нам патрэбна свіння, якая шчабеча, нібы птушка, і выводзіць усялякія рулады, як салавей» [3, с. 218].

Гэтая свіння сядзела ў клетцы і спявала розныя рамансы. Паны кармілі яе цукеркамі, тартамі, «мармялядай» ды іншай заморскай ежай, але потым ім стала шкада свінню і яны вырашылі адпусціць яе на волю.

У творы «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі», як і ў чарадзейных казках, дзейнічаюць розныя страшыдлы (пачвара, якая вылупілася з яйка, вялізны Кіт-Велярыб, які здалёк, з-за мора-акіяна, здольны чуць і разумець галасы людзей, незвычайная свіння, якая спявае рамансы і есць салодкае). Аднак у адрозненне ад народных чарадзейных казак галоўныя героі (паны Кубліцкі ды Заблоцкі) не змагаюцца з імі дзеля перамогі праўды і справядлівасці. Персанажы П. Васючэнкі не падобныя да традыцыйных герояў чарадзейнай казкі, напрыклад, да Івана Царэвіча, які змагаўся са Змеем-Гарынычам — увасабленнем варожых сіл. Паны Кубліцкі ды Заблоцкі подзвігаў не здзяйсняюць, яны змагаюцца пераважна за свае прагныя жаданні, увесь час трапляючы ў камічныя сітуацыі.

**Заключэнне.** У творы П. Васючэнкі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» адбылася трансфармацыя казачнага чарадзейнага сюжэта. Па сваім змесце гэтая кніга камічная і філасофская, прыдатная для чытання як дзецям, так і дарослым. У дзяцей выклічуць цікавасць розныя фантастычныя істоты, а дарослым чытачам казка дасць магчымасць яшчэ раз асэнсаваць праблему празмернасці людскіх жаданняў на прыкладзе жыцця паноў Кубліцкага ды Заблоцкага.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2005. — Т. 1. А—К. — С. 606—609.

2. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя / склад.: М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мінск : Выш. шк., 2003. — 123 с.

3. Дзікі голуб : зб. сучас. беларус. прозы і крытыкі / уклад. М. Мінзер. — Мінск : Літ. і Мастацтва, 2011. — С. 146—230.